| | | | |
|---|---|---|---|
| Усходне-Пруская аперацыя рускіх войскаў | Жнівень – верасень 1914 г. | Усходняя Прусія | Наступленне рускіх войскаў з мэтай сарваць наступленне галоўных сіл Германіі супраць Францыі. Паражэнне і адступленне рускіх войскаў |
| Бітва на рацэ Марне | 5–12 верасня 1914 г. | Паміж Вердэнам і Парыжам | Паражэнне нямецкай арміі, зрыў стратэгічных планаў, арыентаваных на хуткую “маланкавую вайну” і вывад Францыі з вайны. Германіі давялося вясці вайну на два фронты. |
| Першае прымяненне хімічнай зброі | Красавік 1915 г. | Раён г.Іпр (мяжа Францыі і Бельгіі) | Ахвярамі атакі адразу сталі 5 тыс. чалавек, пазней – яшчэ 10 тысяч. |
| «Вердэнская мясарубка» | 21 лютага – 21 снежня 1916 г | Тэрыторыя Францыі ў раёне Вердэна | Ніякіх тактычных і стратэгічных вынікаў не прынесла: да завяршэння бітвы лінія фронта вярнулася да рубяжоў, якія абедзве арміі займалі ў лютым 1916 г. Абодва бакі страцілі каля 1 млн чалавек. |
| Брусілаўскі прарыў | Май – ліпень 1916 г. | Галіцыя і Букавіна (Заходняя Украіна) | Наступальная аперацыя рускіх войскаў. Перамога рускай арміі над аўтра-венгерскімі і германскімі войскамі. Страты іх склалі каля 1,5 млн чалавек забітымі, параненымі і палоннымі. |
| Ютландская бітва | 31 мая – 1 чэрвеня 1916 | Паўночнае мора, на паўночны захад ад п-ва Ютландыя | Абодва бакі аб’явілі аб сваёй перамозе. Страты Германіі склалі ўдвая менш за страты Велікабрытаніі. Але германскаму флоту так і не ўдалося прарваць брытанску блакаду, англічане захавалі сваё панаванне на морах. |
| Аперацыя на рацэ Соме | Чэрвень – лістапад 1916 г. | Паўночны ўсход Францыі | Беспаспяховыя спробы англа-французскіх войскаў прарваць абарону праціўніка, страты саюзнікаў склалі каля 800 тыс. чалавек. |
| Брэст-Літоўскі мірны дагавор | 3 сакавіка 1918 г. | г. Брэст-Літоўск | Бальшавіцкі ўрад Савецкай Расіі заключыў сепаратны мір з Германіяй. Расія выйшла з вайны |
| Другая бітва на Марне | Ліпень – жнівень 1918 г. | Паміж Вердэнам і Парыжам | У выніку кровапралітных баёў нямецкія войскі не ўтрымалі сваіх пазіцый і пачалі адыходзіць да мяжы. Германія вымушана была перайсці да татальнай абароны |
| Камп’енскае перамір’е | 11 лістапада 1918 г. | Камп’енскі лес, вагон маршала Фоша | Перамір’е паміж дзяржавамі Антанты і Германіяй, спыненне баявых дзеянняў |